**А. А. Прыходзька**

# ЖАНЧЫНЫ БЕЛАРУСІ
# Ў ВЫПРАБАВАННЯХ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫЙНАЙ ВАЙНЫ
## (на прыкладзе Таццяны Андрэеўны Бароўскай)

Асабістыя ўспаміны з’яўляюцца важнай крыніцай гістарычнай памяці. У нашым выпадку размова ідзе пра вусны расповед маёй землячкі, ураджэнкі Лельчыцкага раёна Таццяны Андрэеўны Бароўскай.

Паводле яе ўспамінаў, у студзені 1943 года тураўскія паліцаі ў складзе нямецкага паліцэйскага атрада адправіліся на правядзенне карнай акцыі. Прычынай яе стаў разгром партызанамі пад камандаваннем Каўпака нямецкай калоны ў чатырох кіламетрах ад вёскі Тонеж на шашы з Лельчыц у Тураў.

Цяпер гэта самая звычайная палеская вёска. У самым яе цэнтры, на тэрыторыі цвінтара, знаходзіцца абеліск, вядомы ўсім. Нельга прайсці каля яго і не прачытаць надпіс: «Здесь похоронены 262 жителя деревни Тонеж, зверски замученные немецко-фашистскими захватчиками 6 января 1943 года».

Як успаміналa Т. А. Бароўская, гэта лічба магла быць на аднаго чалавека большай. Калі ў вёску прыехалі карнікі, яны пачалі зганяць людзей, якія здагадаліся, што на смерць. Калі нехта адмаўляўся ісці, яго забівалі на месцы. Немцы і паліцэйскія ні шкадавалі нікога: ні малога, ні вялікага.

Людзі стаялі, каля цвінтара, непадалек ад разбуранай царквы, у якую немцы загадалі людзям зайсці. Пасля паставілі кулемёты у праёмы вокан і ў гэты момант усе жырахы зразумелі, што яны у пасцы. Жанчыны прытулялі да сябе дзяцей, каб неяк абараніць. У гэта час нямецкі камандзір нешта скамандаваў, пасля чаго пачулася, як шчоўкнулі затворы кулямётаў. Нейкія жанчыны ў гэты момант ставалі на калені і пачыналі маліцца, каб неяк зберагчысь. Сярод гэтых людзей і была маці чатырох дзяцей – Таццяна Андрэеўна Бароўская.

У адзін момант афіцэр падняў руку з чорнай скураной пальчаткай, і адразу ўсе заціхлі, навта дзеці, якія дагэтуль пакалі. Усе чакалі, што адбудзецца далей. І пасля таго як немецкі афіцер апусцій сваю руку, адразу з кулемётау паляцелі вогненныя струмені, якія падразалі людзей як снапы. Вяскоўцы кідаліся, хто куды ў надзее ўратавацца. Але кулямёты стралялі і стралялі. З кожнай хвілінай натоўп радзеў, Ва ўспамінах гаворыцца, што яна ўжо не памятала, як апынулася пад купай забітых жаночых цел. Але потым навакол стала ціха, толькі немцы хадзілі і дабівалі, тых хто застаўся ў жывых. Падышлі яны і да Тацянны Андрэеўны. Яна адчула нешта балючае, нібы ёй аппякло руку і пасля чаго знепрытомнела. Пасля гэтых зверстваў карнікі аблілі кожны дом бянзінам і падпалілі. Таццяна праляжала сярод трупай аднасяльчан да вечара, а з наступленнем цемры без абутку, параненая, знямоглая, яна накіравалася ў лес. Незвяртаючы ўвагі ні на што, яна бегла расказаць людзям пра зверствы карнікаў. На ўзлеску яе падабралі вяскоўцы. Пасля гэтага яна доўга знаходзілася ў партызанскім шпіталі.

Гэта толькі адзін прыклад з ваеннага лёсу беларускай жанчыны, якая мужна змагалася за перамогу. Але колькі застаецца яшчэ не вядомых імён і подзвігаў жанчын, якія ўнеслі вялікі ўклад у барацьбе за нашу будучыню.